ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

,90

ЧАЦВЕР
1
САКАВІКА
№ 7(1636)

ОРГАН ПАРТКОМА,
РЭКТАРАТА,
КАМСАМОЛЬСКАГА
І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА
ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

РАДЫЯФОБІЯ

ЛЯЦЯЦЬ «ВУТКІ»

Стрэлка «радыяфобаметра» апошнім часам зноў рэзка зашкаліла ля панічнай рыскі. Радыяцыйная небяспека выяўляецца то на месцы жылога дома, то ва універсітэцкім двары і, нарэшце, у складскім памяшканні аэрапорта «Мінск-2». І калі першыя два названыя факты сродкі масавай інфармацыі не вельмі смакавалі, то трэці прыйшоўся да спадобы амаль усім цэнтральным рэспубліканскім выданням. Нават газета «Известия» вуснамі свайго ўласнага карэспандэнта ў Беларусі М. МАТУКОЎСКАГА распавяла пра гэтую сітуацыю ў стылі лепшых дэтэктыўных твораў. «Беларускі універсітэт», магчыма, і прамаўчаў бы сціпла: навошта ўмешвацца ў істэрычную пераклічку «грандаў». Калі б так моцна не разбушаваўся гнеў нашых «аўтарытэтных» калег вакол універсітэта, які чамусьці ў адзін голас абвінавачвалі ў стварэнні «небяспечнага радыяцыйнага становішча ў складзе аэрапорта «Мінск-2». Маўляў, БДУ не забраў своечасова свой радыяцыйны груз, які і стаў крыніцай выпраменьвання. Растлумачыць гэтую журналісцкую версію мы папрасілі прарэктара па навуковай рабоце СТАНІСЛАВА СТАНІСЛАВАВІЧА ШУШКЕВІЧА.

— Універсітэцкая лабараторыя службы радыяцыйнай бяспекі адразу ж правяла расследаванне па гэтаму факту абвінавачвання. Ні на адным з сямі «радыяцыйных» пакункаў не было слядоў пашкоджання. І на адлегласці больш за 30 сантыметраў ад іх дазіметрычныя прылады ўжо не фіксавалі выпраменьванне. Самы актыўны з грузаў — фосфар-32 па сваёй шкоднасці ўступае нават звычайным грыбам, якія мы збіраем, напрыклад, у лясах Міншчыны. Зрэшты, яго ва універсітэт даставілі ў строга ўстаноўлены па сертыфікату час. Астатнія ізатопы ў транспартных дакументах значыліся як «некароткачасовыя» і могуць захоўвацца на складзе доўгі час. Яны не нясуць пагрозы здароўю грузчыкаў і нават пры самым няўдалым абыходжанні не «высвецяць» такі фон, які зарэгістравалі эксперты ў памяшканні склада. Парушальнік пэўна ўсё-такі ёсць, але да універсітэта ён не мае ніякага дачынення.

Я не апраўдваюся, не спрабую ўратаваць гонар мундзіра. Нават калі б крыніцай выпраменьвання быў і універсітэцкі груз, хіба наша ў гэтым была б віна? Адказнасць за надзейнасць пасылкі нясе адправіцель. (Ён, дарэчы, вядомы, а не тайна за сямю пячаткамі, як канстатуе, у прыватнасці, М. Матукоўскі). Гэта кантора «Ізатоп». Яна адзіная ў Саюзе займаецца падобнымі апэрацыямі з радыяцыйнымі рэчывамі.

Не хацелася б залішне папракаць журналістаў, але ж яны зноў у пагоні за сенсацыяй не здолелі зрабіць больш-менш узважлівыя вывады з таго, што здарылася на складзе аэрапорта. Ганьбіць адрасатаў за несвоечасовае з'яўленне за грузам зручна і проста. Але ж ніхто не падумаў, наколькі зручна і эканамічна выгадна навукова-даследчым інстытутам і універсітэту ганяць аўтамабіль за пакункам, які каштуе 15—20 рублёў. Адлегласць жа да аэрапорта «Мінск-2» складае прыкладна 60 км. Тут і разлікі не патрэбны дакладныя. Відавочна, што лепш было б наладзіць цэнтралізаваны «развоз» радыяцыйных грузаў. Тады і не накопліваліся б яны на складзе ў аварыйнай колькасці.

Для Беларусі значэнне натуральнага гама-фону — ад 0,010 да 0,020 мілірэнтген у гадзіну.

Любы чалавек нашай планеты атрымлівае за год натуральнага фонавага апрамянення прыкладна 100—300 мілібэр.

Дапушчальнае (бяспечнае для здароўя і жыцця) апрамяненне ў нармальных умовах за год — 500 мілібэр, або 0,5 бэра (1 бэр — 0,88 рэнтгена).

АСЦЯРОЖНА: ФОСФАР!

Паляванне за радыяцыяй сёння перайшло за межы раёнаў, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Ледзь толькі супакоіліся страсці па стронцыю, знойдзенаму ва універсітэцкім двары службай радыяцыйнай бяспекі, як выпадкова была выяўлена новая крыніца радыяцыі...

Начальнік універсітэцкай службы радыяцыйнай бяспекі Іван Васільевіч ГАЛАВАТЫ праводзіў дазіметрычны кантроль у лабараторыі кафедры біяфізікі. І якім было здзіўленне супрацоўнікаў лабараторыі, калі дазіметр высвеціў дозу радыяцыі, якая ў 500 разоў перавышала дапушчальны фон. «Адкуль тут узяліся радыеактыўныя рэчывы? — недаўмявалі даследчыкі.— Мы ж з імі даўно не працуем». Узнікла падазрэнне на цагляную сцяну памяшкання, на фарбу, у рэшце рэшт. Аднак «корань зла» хаваўся... у звычайным спідометры з фосфарнымі рыскамі. Прылада гэта прымянялася калісьці ў авіяцыі, а як трапіла ў лабараторыю біяфізікі ніхто не можа ўцяміць. Відаць, хтосьці прынёс на ўсялякі выпадак, не ведаючы, якую пагрозу ўяўляюць для здароўя людзей фосфарныя рысачкі.

Што ж, у дадзеным выпадку проста пашанцавала. Радыеактыўны прыбор выявілі і абясшкодзілі. Але дзе цвёрдая гарантыя, што такія «цацкі» не валяюцца ў людных месцах? Іх жа калісьці выпускалася процьма — «фосфарныя» гадзіннікі, спідометры, цацкі лічыліся прыгожымі, зручнымі і няшкоднымі. Зараз іх, праўда, знялі з вытворчасці.

Калі ж у вас, паважаныя чытачы, захаваліся падобныя прадметы, раім звярнуцца з імі ў службу радыяцыйнай бяспекі універсітэта (галоўны корпус, пакой 527) і праверыць іх на радыеактыўнасць. І яшчэ. Не падбірайце невядомыя вам прылады, не давайце гуляць з імі дзецям. Магчыма, у іх якраз і хаваецца «выпадковая радыяцыйная небяспека».

Заўвага «БУ».

Гэта ўжо не радыяфобія, а мера перасцярогі.

ВЫБАРЧЫ ЎЧАСТАК

Палітычная актыўнасць грамадства вызначаецца палітычнай актыўнасцю кожнага яго члена. За абстрактным голасам — канкрэтны чалавек са сваімі поглядамі і пазіцыяй. Прыйдзе час і нашы спецыялісты-псіхолагі са скурпулёзнасцю навукоўцаў будуць даследаваць асабісты настрой кожнага выбаршчыка. Сёння, напярэдадні выбараў, мы можам толькі прагназіраваць. Удала ці не? Сачыце за падзеямі 4 сакавіка. Пакуль жа прапануем наша апытанне.

Я проста не пайду

— А Вы будзеце галасаваць у час выбараў у мясцовыя Саветы?

Алена ФЯДОТАВА, студэнтка:

— На выбары, хутчэй за ўсё, я проста не пайду. Уявіце сабе, нават не памятаю ўсіх прозвішчаў: некалькі прэтэндэнтаў на месца ў парламенце рэспублікі, гарадскім Савеце і шматлікая колькасць кандыдатаў у народныя дэпутаты райсаветаў... А праграмы складаюцца са спрытам паляўнічага, які рыхтуе пастку для збянтэжаных зайцоў. Мне перадвыбарная «шуміха» даўно надакучыла.

Я падтрымліваю «Дэмакратычную згоду»

— Навошта студэнту дэпутацтва?

Андрэй МУРАШКА, кандыдат у народныя дэпутаты райсавета:

— Шчыра? Каб упэўніцца, якую ролю адыгрывае сацыяльны фактар. Вельмі цікава, колькі ж чалавек прагалосуе за звычайнага студэнта? Я не складаў праграмы, таму што выбаршчыкі наўрад ці паставяць сабе за мэту разабрацца ў яе тонкасцях. У цяперашніх умовах ідзе барацьба асоб: хто спадабаецца? Хоць, на мой погляд, выбары павінны весціся па партыйнаму прынцыпу. І тады б я аддаў свой голас за платформу «Дэмакратычнай згоды». Гэта сіла, якая выступае за канструктыўнае, радыкальнае вырашэнне праблем нашага грамадства. Мне не да спадобы вузкалобая палітыка канфрантацыі і больш прымальнай я лічу пазіцыю грамадзянскага міру: правядзенне радыкальных рэформ без рэвалюцыйнага пераваротy.

Я за альтэрнатыўныя кандыдатуры

— Як паводзілі б сябе Вы, трымаючы ў руках бюлетэнь выбаршчыка з прозвішчам толькі аднаго кандыдата ў дэпутаты?

Ігар ВЕРХАВОДКА, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта:

— Складанае пытанне. Усё залежыць ад таго, ці ведаю я гэтага чалавека. Калі не — абавязкова выкраслю.

Спецыфіка нашых выбараў — мінімум інфармацыі пра кандыдатаў. Таму часцей стрымліваюцца — галасуюць за тых, чые прозвішчы калісьці пачулі.

Пры існуючым нівеліраванні кандыдатаў у свядомасці выбаршчыкаў верагодным становіцца галасаванне па анкетных даных. Прадстаўнік партапарату? Далоў са спісу! І каму справа да таго, што менавіта ў яго могуць быць самыя прагрэсіўныя погляды? Разбірацца няма часу.

Я — за альтэрнатыўныя кандыдатуры. Не таму, што гэта гарантыя дэмакратычных Саветаў, проста людзі калісьці павінны пачынаць вучыцца выбіраць.

На першым этапе (год назад) перамаглі тыя, хто на фоне грамадскага кансерватызму выглядаў неардынарна. На другім — рэвалюцыйныя лозунгі ўжо не ўздзейнічаюць, з асаблівай асалодай «помсцяць» прадстаўнікам «набіўшых аскому» палітычных структур. І толькі на трэцім этапе, калі выбаршчыкі пачнуць надаваць належную ўвагу пунктам праграм кандыдатаў, магчымы дэмакратычныя выбары.

Пакуль жа людзьмі валодае палітычная апатыя, абумоўленая як нізкім узроўнем агульнай культуры, так і стратай веры ў якія-небудзь перамены.

СЦЭНА МІЛАСЭРНАСЦІ

РАБІ ДАБРО

Добрая справа каштавала не так ужо і многа — хто ж у наш час ад сэрца грош адрывае? І ўсё ж большая частка запрашальных білетаў на чатыры дабрачынныя канцэрты творчых калектываў універсітэта, прысвечаных дзецям чарнобыльскай трагедыі, так і засталася ляжаць у студэнцкім клубе.

Сцэна была міласэрнай, калі калектыўна прымалася рашэнне аб пералічэнні сродкаў, атрыманых ад канцэртаў на рахунак № 707801 — Дзецям Чарнобыля. А зала? Бацькі юных артыстаў дзіцячага ансамбля «Крынічка», сябры і знаёмыя «Неруша» і «Крыжачка» — сумны пералік наведвальнікаў.

— Акцыя не ўдалася,— канстатуюць у студэнцкім клубе.

Крыўдна і балюча яе арганізатарам. А ўсім тым, хто свядома адмовіўся рабіць дабро і міласэрным быць?

Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта»: Мікалай МАСТОЎСКІ, Сяргей

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

ПРА ЗМЕНЫ,

што адбыліся на мінулым тыдні ва універсітэце, дакладней за ўсіх сведчаць афіцыйныя дакументы:

Загадам № 127-Л Міністэрства народнай адукацыі ад 19 лютага 1990 года сяляўскі вызвалены «ад пасады рэктара Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з 20 лютага 1990 года ў сувязі з пераводам на работу ў АН БССР на пасаду члена Прэзідыума».

Выкананне абавязкаў рэктара Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з 20 лютага 1990 года ўскладзена на першага прарэктара, прарэктара па вучэбнай рабоце універсітэта тав. Капуцкага Фёдара Мікалаевіча з 20 лютага.

◆◆◆

На пленуме партыйнага камітэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна разгледжаны задачы партыйнай арганізацыі ў сувязі з перабудовай кіравання ў сістэме народнай адукацыі, прынятай на XIX канферэнцыі КПСС, і ўзаемаадносін партыйнага камітэта з адміністрацыяй, прафсаюзнымі і камсамольскімі арганізацыямі ў новых умовах. Вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па ажыццяўленні рашэнняў XIX канферэнцыі КПСС, якія накіраваны на ўдасканаленне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, актывізацыю работы партыйных арганізацый, павышэнне іх ролі ў кіраванні ўніверсітэтам, умацаванне дысцыпліны і арганізаванасці, павышэнне адказнасці кожнага камуніста за выкананне партыйных рашэнняў, за стан спраў на ўчастку работы.

Разгледжаны пытанні ўдасканалення структуры кіравання ўніверсітэтам, рэарганізацыі некаторых кафедр, стварэння новых, а таксама ўдасканалення ўзаемаадносін паміж кафедрамі і факультэтамі. Вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па ўдасканаленні работы з кадрамі, павышэнні іх адказнасці за выкананне службовых абавязкаў, умацаванні дысцыпліны, арганізаванасці, павышэнні ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладчыцкага складу, удасканаленні работы з моладдзю, павышэнні ролі камсамольскіх арганізацый у вучэбна-выхаваўчым працэсе, у арганізацыі вольнага часу студэнтаў.

Разгледжаны пытанні ўдасканалення работы партыйнага камітэта па ідэалагічнай рабоце, павышэнні ролі грамадскіх навук у падрыхтоўцы спецыялістаў, удасканаленні работы з кадрамі, павышэнні іх адказнасці за выкананне службовых абавязкаў, умацаванні дысцыпліны, арганізаванасці, павышэнні ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладчыцкага складу, удасканаленні работы з моладдзю, павышэнні ролі камсамольскіх арганізацый у вучэбна-выхаваўчым працэсе, у арганізацыі вольнага часу студэнтаў.

Разгледжаны пытанні ўдасканалення работы партыйнага камітэта па ідэалагічнай рабоце, павышэнні ролі грамадскіх навук у падрыхтоўцы спецыялістаў, удасканаленні работы з кадрамі, павышэнні іх адказнасці за выкананне службовых абавязкаў, умацаванні дысцыпліны, арганізаванасці, павышэнні ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладчыцкага складу, удасканаленні работы з моладдзю, павышэнні ролі камсамольскіх арганізацый у вучэбна-выхаваўчым працэсе, у арганізацыі вольнага часу студэнтаў.

НЯМА ПРАБЛЕМ?

ЦІ ПАТРЭБНА НОВАЯ КАФЕДРА?

Перад кіраўніцтвам універсітэта і гістарычнага факультэта пастаўлена пытанне аб адкрыцці кафедры метадалогіі і метадаў выкладання гісторыі. Рэакцыя на прапанову аказалася затарможанай. Аднак кожнае пытанне патрабуе станоўчага ці адмоўнага адказу...

Разам з «белымі плямамі» і застойнымі зонамі перабудова ў гістарычнай навуцы выявіла і патрэбу ў крытычным пераглядзе ўсяго, што дасягнута. Яна прадугледжвае новае прачытанне твораў заснавальнікаў марксізму-ленінізму, глыбокае вывучэнне метадалогіі гісторыі і дастаткова поўнае валоданне ёю. Гэта абавязковая ўмова барацьбы супраць дэмагогіі «справа» і «злева».

Комплексны падыход да вывучэння гістарычнай рэчаіснасці нельга ажыццявіць без выкарыстання колькаснага і сацыялагічнага метадаў, якія ўваходзяць у паняцце метадалогіі. Хаатычная папулярызацыя выклікала негатыўныя адносіны да іх з боку большасці выкладчыкаў і студэнтаў.

Узрастае апошнім часам значэнне гісторыяграфіі і крыніцазнаўства, асабліва па гісторыі савецкага перыяду. У практыку ўваходзяць альтэрнатыўныя падыходы да аналізу гістарычных працэсаў. Якая склалася ў нас традыцыя ў выкладанні гісторыі? Асвятленне праблем у той ці іншы перыяд з пункту гледжання марксізму-ленінізму, не дапускаючы розна-баковых меркаванняў нават у межах гэтага вучэння. Ні больш ні менш. Неабходна жмець на ўвазе як «вертыкальную», так і «гарызантальную» гісторыяграфію. Крыніцазнаўства закліканаць адказ на пытанні аб рэальным месцы і сапраўдным сэнсе тых ці іншых крыніц, у тым ліку і тых, што раней не выкарыстоўваліся з-за прадузятых адносін да іх ці іх недаступнасці, аб дастатковасці іх базы для аб'ектыўных вывадаў.

З навуковым даследаваннем гістарычнага мінулага асацыіруецца выкладанне гісторыі. Зразумела, важнае значэнне мае не толькі спосаб, якім дабыты тыя ці іншыя вынікі, што падносяцца навучэнцам ці студэнтам, а і як пры гэтым улічаны асаблівасці аўдыторыі і нават кожнага слухача. Аднак у методыцы выкладання сёння інтарэс аўдыторыі, арыентацыя на сенсацыі часцей за ўсё прэвалююць над навуковым гістарычным аналізам. Напрошваецца вывад: ці не мэтазгодна цесна звязаць пытанні методыкі выкладання з метадалогіяй гісторыі? Тады навукова-даследчы і педагагічны працэсы ў ВНУ знойдуць сваё лагічнае завяршэнне, і ўласная метадалогія даследавання будзе дапоўнена ўласнымі метадамі выкладання.

Патрэбна прызнаць, што спецыяльнага навучання студэнтаў і аспірантаў метадалогіі гістарычнай навукі і методыкі выкладання гісторыі ў іх узаемасувязі не было і не вядзецца. Няма яго і ў дзеючых сістэмах павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў, у прыватнасці на ФПК. Для выпраўлення становішча недастаткова таго патэнцыялу, які маюць гістарычныя кафедры. Больш таго, існуе небяспека, што істотнага паварота ў гэтым напрамку можа і не адбыцца (знізіўся грамадска-палітычны пад'ём сярод студэнтаў, які адзначаўся год-два назад, інтарэс выкладчыкаў канцэнтруецца вакол агульных рэканструктыўных працэсаў у краіне і г. д.). Таму неабходна стварэнне такога аб'яднання аднадумцаў, для якіх дзейнасць, звязаная з вывучэннем метадалогіі гісторыі і метадаў выкладання, стала б прафесійнай.

Патрэба ў арганізацыі новай кафедры ўжо вынікае з апошняга вучэбнага плана для гістарычных факультэтаў універсітэтаў. Ён прадугледжвае ўвядзенне дысцыпліны «Метадалагічныя праблемы гістарычных навук», якая раней не вывучалася і ў рамках якой павінны разглядацца такія пытанні, як прынцып гістарызму, роля гістарычнага факта, дастатковасць базы крыніц, тэарэтычныя асновы перыядызацыі і г. д. Авалоданне гэтым курсам з'яўляецца нялёгкай справай. Наяўныя дапаможнікі не могуць быць выкарыстаны з-за састарэласці матэрыялу і «цяжкай» мовы выкладання. Іх патрэбна стварыць нанова і рабіць гэта абавязаны спецыялісты з базавай гістарычнай адукацыяй. Акрамя таго, план прадугледжвае павелічэнне нагрузкі па спецкурсах, час на якія выкарыстоўваецца малаэфектыўна і нярэдка зусім прападае. Уводзяцца фактычна новыя курсы па гісторыяграфіі і крыніцазнаўству, у сувязі з чым узнікае рэальная небяспека іх вывучэння на нізкім прафесійным узроўні.

Гістарычны факультэт не мае кафедры методыкі выкладання. Аднак тут ёсць неабходныя перадумовы для яе арганізацыі ў больш шырокім варыянце — з навучаннем метадалогіі, гісторыяграфіі, крыніцазнаўства, у тым ліку архіва- і музеязнаўства, і методыкі выкладання гісторыі ў навучальных установах усіх узроўняў, са спецыялізацыяй студэнтаў у галіне гісторыяграфіі і крыніцазнаўства, з распрацоўкай навуковых праблем і стварэннем вучэбных дапаможнікаў па ўсіх гэтых напрамках. На факультэце назапашаны як станоўчы, так і адмоўны вопыт у навучанні метадам выкладання гісторыі. Распрацаваны і апрабіраваны асобныя лекцыі і спецкурсы па метадалагічных праблемах і колькасных метадах гістарычнага даследавання. Чытаюцца такія дысцыпліны, як гісторыяграфія і крыніцазнаўства гісторыі СССР, прычым закранаюцца часткова і іншыя раздзелы ўсеагульнай гісторыі і гісторыі БССР. Створаны і паспяхова эксперыментуецца курс гісторыяграфіі гісторыі СССР савецкага перыяду з выкарыстаннем АНС на базе ЭВМ, даследуюцца праблемы гісторыяграфіі, метады вывучэння і выкладання гісторыі. Паралельна фарміруецца адпаведная матэрыяльная база.

Такая кафедра магчыма і як міжвузаўская — не ў сэнсе падмены ці дубліравання работы іншых навучальных устаноў, а менавіта як інтэгруючы цэнтр. Думаецца, стварыўшы такую кафедру, універсітэт палепшыць навучанне студэнтаў методыцы выкладання, выкарыстоўваючы пры гэтым багаты вопыт педагагічнага інстытута імя М. Горкага. З другога боку, інстытут мог бы разлічваць на павышэнне тэарэтычнага ўзроўню сваіх студэнтаў. У такім аб'яднанні зацікаўлены Інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук ВНУ, Мінскі інстытут культуры, Рэспубліканскі абласны і гарадскі інстытуты ўдасканалення настаўнікаў, Рэспубліканскі інстытут павышэння кваліфікацыі работнікаў народнай адукацыі.

Неабходны рэальныя крокі на шляху паскарэння перабудовы гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі. Зараз варта ўсвядоміць такую неабходнасць і, пераадолеўшы вядомы кансерватызм, прыступіць да справы. Ад гэтага ў многім залежыць, наколькі праўдзівым і справядлівым будзе наш погляд у мінулае, наколькі эфектыўным будзе выкладанне і вывучэнне гісторыі.

У. СІДОРЦАЎ,
доктар гістарычных навук.

ВЫБАРЫ І НАШ ВЫБАР

СЛУЖЫЦЬ ЗАКОНАТВОРЧАСЦІ

ВІЗІТКА. Георгій Аляксандравіч Варабей — дацэнт юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Валодае вопытам работы ў апараце Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Юрыспрудэнцыя — яго род занятак і хоббі. Грамадская работа — старшыня рэвізійнай камісіі Саюза кааператараў БССР. Вылучаны кандыдатам у народныя дэпутаты Беларускай ССР па Голубеўскай выбарчай акрузе № 16.

— Георгій Аляксандравіч, быць народным дэпутатам сёння няпроста. Хаця б таму, што сітуацыя ў рэспубліцы складаная. Як лічыце, ці хопіць у Вас вопыту, ведаў, бо людзі ж будуць прыходзіць з рознымі пытаннямі, не толькі юрыдычнымі?

— Заўважу, любое пытанне — у першую чаргу юрыдычнае. Сямейная сварка ці забруджанне навакольнага асяроддзя, канфлікт з кіраўніцтвам або ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу — усё гэта павінна разглядацца ў адпаведнасці з законам, які — адзін для ўсіх. Іншая справа, што да гэтага часу законатворчасць у нас пляцецца ў хвасце. Мяркуйце самі. З'явіліся кааператывы, а разам з імі і розныя негатыўныя з'явы, звязаныя з гэтым рухам. Нам бы пакараць хапуг і рвачоў, ды няма такога закона. А рэкет, наркаманія...

— За якія ж законы Вы будзеце выступаць у першую чаргу, стаўшы народным дэпутатам?

— Важнейшым маім праграмным тэзісам з'яўляецца патрабаванне хутчэйшага стварэння ў нашай краіне прававой дзяржавы. Упэўнены, што толькі яна здольна раскрыць кожнаму чалавеку магчымасць пражыць сваё жыццё не па прадпісаннях шчасцедаючага начальства, а свабодна рэалізуючы свае ўласныя мэты і задачы, абапіраючыся на даныя ўсім нам прыродай розум і энергію, дзелавітасць і ўменне.

Чалавек — вось аснова ўсяго. І мы павінны клапаціцца не аб міфічным шчасці ў аддаленым будучым, а аб свабодзе асобы, якая рэалізуе сёння ўсе свае магчымасці. Вось фундамент агульначалавечых каштоўнасцей, на якім трымаецца прававая дзяржава.

— І ўсё ж некаторыя разважаюць прыкладна так: добра ці дрэнна, але жылі мы неяк і без прававой дзяржавы, галоўнае, былі б паліцы ў магазінах поўныя.

— Такія меркаванні бытуюць з-за нашай прававой непісьменнасці. Мы павінны былі дабіцца таго, чаго ў нас няма, прававым шляхам. Не выканала прадпрыемства дагаворныя ўмовы — прыцягнуць кіраўніцтва да крымінальнай адказнасці.

— Георгій Аляксандравіч, як сведчыць статыстыка, у мінулым годзе, у параўнанні з 1988-м, колькасць правапарушэнняў у нас у рэспубліцы павялічылася больш чым на 36 працэнтаў. Ці можна, на Ваш погляд, неяк змяніць сітуацыю, спыніць рост злачыннасці?

— У першую чаргу неабходна падняць аўтарытэт праваахоўных органаў. У апошні час мы праявілі асаблівую схільнасць да крытыкі. Не абышла гэта хваля і міліцыі. Патрэбна прызнаць, што часта крытыкавалі справядліва, але тым не менш аўтарытэт органаў унутраных спраў быў сур'ёзна падарваны. Зараз патрэбна зарабляць яго нанова.

Другі момант — тэхнічная ўзброенасць міліцыі. Параўнайце дзве такія лічбы. У ЗША паставому паліцэйскаму, каб атрымаць любыя звесткі, спатрэбіцца дзесяць мінут, а ў нас — мінімум тры дні.

І яшчэ адна праблема, якую нам ніяк не ўдаецца вырашыць,— фінансавая. Не выручае нават такая папулярная форма папаўнення «кашалька» міліцыі, як зварот за дапамогай да грамадскасці. Толькі не варта забываць, што танная юстыцыя надта дорага абыходзіцца дзяржаве.

— Вас, як правазнаўцу, у першую чаргу хвалююць праблемы юрыдычнага характару. Але ж існуе і безліч іншых. Напэўна, няма сёння ніводнага кандыдата, як, між іншым, і наогул чалавека, якога б не кранала пытанне, звязанае з аховай навакольнага асяроддзя. Агульная экалагічная абстаноўка ў нашай рэспубліцы надзвычай складаная. Ці бачыце Вы якія-небудзь шляхі яе стабілізацыі?

— Гэты крытычны стан мы звязваем у асноўным з чарнобыльскай трагедыяй. Але экалогія — гэта не толькі Чарнобыль. Выйдзіце калі-небудзь на вуліцу, падніміцеся на вышыню і паглядзіце навокал. Чорныя клубы дыму падымаюцца ў блакітнае неба — гэта нашы прадпрыемствы так «клапоцяцца» пра экалогію. А дымавыя шлейфы за аўтатранспартам — хіба яны прыбавяць нам здароўя? І як жа караюцца віноўныя? На мой погляд, патрэбна зрабіць так, каб матэрыяльную адказнасць нёс непасрэдны парушальнік экалагічнай дысцыпліны. Віноўны — плаці штраф з уласнай кішэні. Прычым, пералічваць яго абавязкова на мерапрыемствы, звязаныя з аховай прыроды.

— Георгій Аляксандравіч, скажыце шчыра: у выпадку, калі выйграеце перадвыбарную барацьбу і станеце народным дэпутатам, ці пакінеце Вы работу ва універсітэце?

— Я хацеў бы цалкам прысвяціць сябе заканадаўчай дзейнасці, каб мае веды як вучонага, юрыста прынеслі карысць грамадству, людзям.

Запісала З. АЛЯШКЕВІЧ.

НА ЎСЯЛЯКІ ВЫПАДАК

Вастрыце пер'і!

Яны — «залатыя». Дакладней, могуць стаць «залатымі» ў вашых руках, калі будзеце наведваць заняткі на аддзяленні журналістыкі факультэта грамадскіх прафесій. Усяго за два гады навучання вы без адрыву ад сваёй асноўнай спецыяльнасці зможаце авалодаць майстэрствам журналіста.

За «публіцыстычнымі» пер'ямі звяртайцеся на адрас: вул. Бабруйская, 9, пакой 74. Прыёмныя дні — кожны чацвер а 18-й гадзіне.

Гайда ў Шаталавы!

Усяго за тры месяцы юнакі і дзяўчаты (студэнты 2—4 курсаў) набудуць вопыт арганізацыі работы з дзецьмі і падлеткамі ў лагерах Планерскага і Арджанікідзе (г. Феадосія).

І ў той час, калі важатыя-«дзікуны» не знойдуць сабе месца ад разгубленасці, слухачы падрыхтоўчых курсаў хутка з'арыентуюцца, на благі канец зазірнуўшы ў канспекты па методыцы арганізацыі адпачынку дзяцей у піянерскім лагеры, успомніўшы практычныя заняткі па метадычных распрацоўках масавых мерапрыемстваў: спартыўных спаборніцтваў, КВЗ, тэатралізаваных прадстаўленняў, гуртковай рабоце. Знайсці выйсце з самых непрадказальных сітуацый ім дапаможа веданне псіхалогіі дзіцяці.

На Шаталавых рыхтуе аддзяленне работы з дзецьмі і падлеткамі факультэта грамадскіх прафесій. Звяртайцеся на адрас: вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакой 61, дэканат ФГП. Тэл. 2-98.

ХТО МЫ? ЯКІЯ ВЫ?

Цёмнае пакрывала сакрэтнасці спадае не толькі з гістарычных падзей, ракетных баз, бюджэту партыйнага апарату, але і з ладу жыцця нашых аднагодкаў, калег з-за мяжы. Амаль штомесяц ва універсітэт прыязджаюць госці з замежных навучальных устаноў.

Вось і нядаўна нашу альма-матэр наведалі студэнты Сеульскага універсітэта — старэйшай ВНУ Паўднёвай Карэі. І калі мы рыхтуемся адзначыць свой сямідзесяцігадовы юбілей, то Сеульскі універсітэт ужо святкаваў стагоддзе. Дарэчы, у параўнанні з нашым гэты універсітэт мае і колькасную перавагу. Тут праходзяць навучанне на 60 факультэтах дзесьці каля 20 тысяч студэнтаў. Пры універсітэце працуюць 17 каледжаў. Выпускнікі Сеульскага універсітэта даволі «высока цэняцца» ў Паўднёвай Карэі, іх ахвотна прымаюць на працу любыя фірмы і дзяржаўныя ўстановы.

ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

Патрыярх беларускага антыказнаўства

«Персу-ворагу, які празмерна выхваляўся: праз мноства стрэл сонца не пабачыце,— нейкі лакедэманянін адказаў: «Будзем змагацца ў цяні!» Кожны студэнт-гісторык у 50—70-я гады чуў гэту крылатую фразу ад прафесара Фёдара Макаравіча Нячая, які з захапленнем апавядаў аб мужнасці 300 спартанскіх воінаў. Спытайце аб гэтым і зараз выпускнікоў гістфака тых гадоў і амаль ад кожнага пачуеце яе на лацінскай мове. Няхай не ўсе з іх сталі спецыялістамі-антыказнаўцамі але курс гісторыі старажытнай Грэцыі і Рыму, які бліскуча выкладаў прафесар Ф. М. Нячай, пакінуў у іх станаўленні як гісторыкаў глыбокі след.

9 сакавіка Ф. М. Нячаю спаўняецца 85 гадоў. Яго лёс — гэта лёс яго пакалення. Маючы за плячыма вопыт работы настаўніка ў школе, пасля службы ў Чырвонай Арміі Ф. М. Нячай у 1933 годзе паступіў у Растоўскі педагагічны інстытут, пасля паспяховага заканчэння якога быў прыняты ў аспірантуру Маскоўскага дзяржуніверсітэта імя М. В. Ламаносава. Яго навуковым кіраўніком быў выдатны савецкі вучоны А. В. Мішулін. У 1940 г. Ф. М. Нячай абараніў кандыдацкую дысертацыю «Саюзніцкая вайна ў першакрыніцах».

З 1945 г. Ф. М. Нячай назаўсёды звязаў свой лёс з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. З 1946 па 1953 год ён працаваў дэканам гістарычнага факультэта, а затым узначаліў кафедру гісторыі старажытнага свету (1953—1955 гг.) і кафедру гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў (з 1961 г.). Яму пашчасціла працаваць разам з акадэмікам М. М. Нікольскім. У 1965 годзе Ф. М. Нячай абараніў доктарскую дысертацыю.

Ф. М. Нячай плённа распрацоўваў самыя складаныя праблемы старажытнай гісторыі. Яго манаграфіі «Рым і італікі», «Утварэнне рымскай дзяржавы» атрымалі высокую адзнаку не толькі савецкіх, але і замежных даследчыкаў. Прайшло некалькі дзесяцігоддзяў, але гісторыкі зноў і зноў звяртаюцца да іх: яны па-ранейшаму застаюцца актуальнымі. У апошні час Ф. М. Нячай займаецца даследаваннямі праблем гісторыі Грэцыі часоў Гамера.

З першага года навучання вучні памятаюць яго наказ, што ў навуцы бывае важным не толькі вырашыць праблему, але і паставіць яе. Ф. М. Нячай вучыў сваіх студэнтаў і аспірантаў быць самастойнымі ў вывадах, падвяргаць сумненню палажэнні самых вялікіх аўтарытэтаў навукі, калі яны пярэчаць матэрыялам першакрыніц. Для яго галоўным у навуцы заўсёды была праўда.

Ф. М. Нячай за сваю плённую працу адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі. Зараз ён на заслужаным адпачынку. Яго вучні, выпускнікі гістфака віншуюць Фёдара Макаравіча з юбілеем і жадаюць не толькі моцнага здароўя, але і новых поспехаў у навуцы.

М. КОРЗУН, дацэнт;
В. ФЯДОСІК, дацэнт.

ГУТАРКІ З НАГОДЫ...

працаўладкаванне

Аб'ява, змешчаная на стэндзе, што стаіць у холе першага паверха галоўнага корпуса універсітэта, паведамляе: «У рэстаране «Свіслач» ёсць вакантныя месцы на зімова-вясенні перыяд: швейцара, гардэробшчыка. Звяртацца ў аддзел кадраў рэстарана».

Куды звяртацца? У аб'яве, праўда, ёсць прыпіска, што ўсе пытанні — у аддзел кадраў. Але ні дакладнага адрасу, ні нумара тэлефона нідзе не значылася. Давялося затраціць нямала часу, каб удакладніць, куды ж тэлефанаваць (і гэта ўлічваючы, што ў мяне ёсць службовы тэлефон). Нарэшце, у аддзеле кадраў рэстарана прыемны мужчынскі голас на маё пытанне: «Ці можна ўладкавацца на работу?» паабяцаў высветліць усё дакладна і пазваніць хвілін праз дзесяць.

Чакаць давялося тры дні. І калі цярпенне скончылася, зноў пачала надакучаць сама.

— Месца гардэробшчыка ўжо занята,— паведаміла мне інспектар аддзела кадраў «Свіслачы» В. А. Кандрахіна,— а на пасаду швейцара мы з большай ахвотай возьмем не студэнта.

Каментарыі, як кажуць, непатрэбныя. Уяўляю, якое расчараванне адчуе студэнт, прайшоўшы па слядах не адной, а дзвюх-трох такіх «ліпавых» аб'яў. Навошта, скажыце, яны, калі адно месца ўжо занята, а другое не для студэнта?

ПІНГ-ПОНГ

Экспрэс-вадзіцелі?

Вядучы папулярнай тэлеперадачы з самай нейтральнай інтанацыяй паведамляе аб «звышдынарнай» з'яве — кожны другі канадзец мае ўласную машыну і, натуральна, вадзіцельскае пасведчанне. Маўляў, і ў нас з гэтым усё ў ажуры і даўным-даўно «адсеклі» хвост чарзе на курсы па падрыхтоўцы вадзіцеляў індывідуальнага транспарту. Яна ж, між тым, цягнецца на два гады наперад. Чуў, што раней дазвалялася здаваць экзамены ў ДАІ на права кіравання транспартным сродкам пасля самападрыхтоўкі...

Ю. МАЛАШЭНЯ,
студэнт-завочнік.

— Экспрэс-падрыхтоўцы і зараз «зялёнае святло»,— пацвердзіў начальнік аддзялення па кантролю за падрыхтоўкай вадзіцельскіх кадраў і экзаменацыйнай рабоце ДАІ УУС Мінгарвыканкома маёр міліцыі Уладзімір Фёдаравіч СВІРЫДОВІЧ.

Асобы, якія самастойна вывучылі правілы дарожнага руху, авалодалі тэхнікай кіравання аўтамабілем, прайшлі медыцынскі агляд, пасля субяседавання ў ДАІ і ўплаты збораў (30 рублёў) залічваюцца ў групы для васьмігадзіннай падрыхтоўкі і здачы экзаменаў. З эксперыментальнай групы ў дваццаць чалавек пасведчанне атрымалі двое. Астатнія засталіся з надзеяй на тое, што наступныя дзве спробы з інтэрвалам у дваццаць дзён будуць больш удалымі.

Інфармацыю аб парадку падрыхтоўкі экспрэс-вадзіцеляў можна атрымаць па тэлефоне 29-49-52 (аўтаадказчык).

Першы блін?

Быў час, пра такое казалі: інтэрнацыянальныя сувязі. Падлічвалі «кругляшы» працэнтаў замежнікаў ад агульнай колькасці студэнтаў універсітэта, з імпэтам пляскалі ў далоні на вечары чарговага зямляцтва, па раскладу наведвалі інтэрнацкія пакоі і лічылі, што гэтыя меры прафілактыкі ўратуюць ад узнікнення «замежных» праблем.

Не ўратавалі. «Ноў проблемз» не атрымалася. Як пясок скрозь пальцы знікалі добразычлівасць і павага ў адносінах паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі. І заўтра наладжваць масты сяброўства, напэўна, было б ужо позна. Таму мы, замежныя студэнты, вельмі ўдзячныя арганізатарам «круглага стала» — першай спробы наладжвання дыялога паміж парткомам універсітэта, дэканатам па рабоце з замежнымі студэнтамі, камітэтам камсамола і прадстаўнікамі зямляцтваў.

Але інфармацыйны абмен не быў бы настолькі плённым, калі б імкненне дзейнічаць сумесна не пацвердзілася б канкрэтнымі рашэннямі аб прадстаўленні замежных студэнтаў у вучоным савеце універсітэта і падрыхтоўцы спецыяльнага рэкламнага выпуску «Беларускага універсітэта».

Шарль МАЙЕКУ,
студэнт 4 курса аддзялення міжнароднай журналістыкі.

АДКРЫЦЦЁ СВАЙГО «Я»

Каму з нас не хацелася калі-небудзь вынайсці штосьці неверагоднае, такое, каб усе пра гэта ведалі і зайздросцілі. Памятаю, у студэнцкія гады мы, як кажуць, валам валілі ў СНТ. Але так нічога новага не адкрыўшы, хутка развітваліся са студэнцкай навуковай, як, між іншым, і са сваімі марамі. І хто ведае, магчыма ў кімсьці з нас загінуў выдатны хімік ці фізік, гісторык ці філолаг.

Чаму так здарылася, што мы страцілі цікаўнасць да навуковай работы? Можа ў нас не хапіла настойлівасці і жадання працаваць, а магчыма наадварот: выкладчыкі не здолелі развіць у нас гэтыя якасці?

Вось чаму звычайна, калі размова ідзе пра студэнцкую навуку, мы недаверліва паціскаем плячыма: маўляў, якая там навука! Але не спяшайцеся скептычна ўсміхацца. Зазірніце ў лабараторыю хіміі фотапрацэсаў НДІ ФХП. Вы пераканаецеся, што ў ёй (гэта не гучныя словы) пануе творчая атмасфера, а студэнты па-сапраўднаму займаюцца навукай. Тут выдатна ўжываюцца побач кандыдаты навук — штатныя «адзінкі» лабараторыі, і зусім яшчэ маладыя навукоўцы. Дарэчы, апошнія не адчуваюць сябе хлопчыкамі на пабягушках. З імі гавораць на роўных, не баяцца даручаць самыя складаныя і адказныя даследаванні. Многія з іх маюць навуковыя публікацыі.

Сяргей Кімавіч Рахманаў — загадчык лабараторыі, кандыдат хімічных навук не так даўно сам быў студэнтам. Тады і пачаў займацца навуковай работай. Спачатку, безумоўна, не ўсё атрымлівалася, часам было крыўдна за чарговую няўдачу, але ніколі не ўзнікала жаданне ўсё кінуць, наадварот, з'яўлялася нейкая ўпартасць і настойлівасць. Хацелася абавязкова даказаць сабе, што гэта табе пад сілу. У такія вось цяжкія хвіліны вельмі дарэчы была падтрымка выкладчыкаў. І не толькі мудрай парадай, але і практычнай дапамогай.

Ужо ў той час С. К. Рахманаў здолеў згуртаваць вакол сябе студэнтаў малодшых курсаў. Зараз лепшыя з іх складаюць ядро лабараторыі, якую ён узначальвае. Амаль усе абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Але гэта не дае падстаў высакамерна адносіцца да студэнтаў. Тут стараюцца пазбягаць залішняй субардынацыі. Усе: і супрацоўнікі лабараторыі, і студэнты — калегі. Яны робяць агульную справу. І атрыманыя вынікі — таксама агульныя. За няўдачы і памылкі кожны адказвае ў поўнай меры.

Як жа прыходзяць сюды студэнты? Ці ўсе маюць магчымасць працаваць над тэмамі, якія вызначаюць асноўны напрамак работы лабараторыі? Якая карысць лабараторыі ад студэнтаў і наадварот? Адказ на гэтыя і іншыя пытанні я атрымала, калі пагутарыла з С. К. Рахманавым.

Сяргей Кімавіч ці то жартам, ці то ўсур'ёз заўважыў: да нас могуць трапіць толькі хлопцы, дзяўчатам тут рабіць няма чаго. Я спачатку засумнявалася, але калі пераканалася, што тыя, хто хоча працаваць і дабівацца пэўных вынікаў, сапраўды правядзіць тут увесь вольны час, амаль згадзілася з субяседнікам. Жанчыне і сапраўды цяжка сумяшчаць службовыя абавязкі з хатнімі. Сяргей Кімавіч, як і я, пераканаўся ў гэтым. Але яго непакоіць іншае.

— На жаль, з кожным годам змяншаецца колькасць рабят, якія цалкам прысвячаюць сябе навуцы,— выказвае занепакоенасць С. К. Рахманаў.— Не ведаю, з чым гэта звязана: ці то інтарэсы ў людзей сталі больш рознабаковымі, ці то менш арыентаваны яны на поспех. Часам прыходзяць студэнты, здаецца, і нядрэнныя, а вытрымаць выпрабаваўчы тэрмін не могуць. Няма той настойлівасці, мэтанакіраванасці, самаахвяравання, без якіх не можа існаваць навука. Ёй або ўсё аддай, або нічога. Таму тыя, хто бачыць, што гуж яму не пад сілу, адмаўляюцца ад яго.

У лабараторыі пераканаўся, што лепш падрыхтаваць менш спецыялістаў, але такіх, каб потым не было сорамна перад тымі кіраўнікамі, якія возьмуць іх на работу. Пакуль гэта залатое правіла не падводзіла. Многія выпускнікі працуюць зараз ва універсітэце, у Акадэміі навук БССР, іншых ВНУ. Усе яны маюць добрую рэпутацыю.

— І не толькі як выдатныя спецыялісты,— працягвае размову С. К. Рахманаў,— але і нядрэнныя кіраўнікі. Тыя, хто прайшоў «загартоўку» у нашай лабараторыі, хутчэй пераадольваюць перыяд адаптацыі ў калектыве, умеюць наладжваць вытворчыя адносіны. У сваёй лабараторыі мы не толькі даём прафесійныя навыкі, але і абменьваемся думкамі, вядзём дыскусіі па розных праблемах, абмяркоўваем асабістыя пытанні. І што не менш важна: тут студэнты вучацца быць дысцыплінаванымі.

Зараз у лабараторыі таксама працуюць каля дзесяці студэнтаў (дарэчы, самыя старанныя і здольныя на трэцім курсе залічваюцца на палову стаўкі). Разам з навуковымі супрацоўнікамі яны займаюцца пошукамі шляхоў удасканалення фотапрацэсаў. Правёўшы шматлікія даследаванні, у якіх удзельнічалі і студэнты-хімікі, тут пераканаліся, што фотаматэрыялы, якімі мы звычайна карыстаемся, вельмі недасканалыя, напрыклад, яны маюць нізкую адчувальнасць да святла. Калектыву лабараторыі ўдалося даказаць, што яе можна павысіць, як, дарэчы, і на звычайных чорна-белых матэрыялах атрымаць шматколернае адлюстраванне. Выкарыстанне рэзультатаў гэтых даследаванняў у медыцыне, ядзернай энергетыцы дазволіць павысіць прадукцыйнасць працы і зэканоміць рэсурсы. Важна, што яшчэ студэнтамі будучыя маладыя спецыялісты ўдзельнічаюць у вялікіх і важных справах. Гэта навучыць іх быць сапраўднымі гаспадарамі, думаць па-дзяржаўнаму.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

ПАДРАЎНЯЙЦЕСЯ!

(ПРАВІЛА ЛІНЕЙНАСЦІ)

Пасля знакаў, якія змянілі сваю пазіцыю, мы працягвалі пісаць слова на тым узроўні, на якім аказалася пяро:



ВИЛКИ ПИЛКИ ПЛИТКИ

Усялякае правіла, аднак, мае выключэнне. Правіла лінейнасці (або радковасці) якраз і разглядае выключэнне з агульнага правіла. Не абавязкова пісаць знакі на новым узроўні, можна вярнуцца на асноўную лінію:



ВЫШКИ МЫШКИ СТИШКИ ДЫМКИ

Асабліва ахвотна вяртаюцца на асноўную лінію двухмерныя знакі:



ИСПЁК ИСПИТЬ ИСПЕСТРИТЬ

Правіла лінейнасці дазваляе вяртаць знакі на асноўную лінію нават у тых выпадках, калі чарговая галосная патрабуе новага пад'ёму. Слова «висит» правіла лінейнасці дазваляе пісаць такім чынам:



Галосная і тут прапускаецца, а зычная вяртаецца на асноўную лінію. Аднак нам патрэбна клапаціцца аб тым, каб лёгка прачытаць стэнаграму. Таму слова «висит» лепш пішыце так:



ВИСИТ

Прапускаць галосную і мы будзем толькі ў выключных выпадках, напрыклад, у слове «вышивки»:



ВЫШИВКИ

Без сярэдняй галоснай ўсё-такі можна здагадацца, якое слова застэнаграфавана: выш...вки.

Урок вёў
Уладзіслаў ГЕРАСІМАЎ.

МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

ІМЯ

СПАСЦІГАЮЧЫ СВЕТ ЧАЛАВЕКА

Калі бяруць інтэрв'ю ў Уладзіміра Дашука — кінапубліцыста, выпускніка факультэта журналістыкі, чамусьці пачынаюць з яго прозвішча. На мой погляд, гэты чалавек у сваім творчым і асобасным развіцці дасягнуў такога ўзроўню, калі рабіць акцэнт іменна на гэтым няёмка. Так, Валодзя нарадзіўся ў сям'і вядомага майстра беларускага дакументальнага кіно Віктара Дашука, стужкі якога папоўнілі класіку дакументалістыкі: цыклы «У вайны не жаночы твар», «Я з забітай вёскі». Безумоўна, гэта аказала ўплыў на лёс сына, яго выбар, як і відавочна тое, што сын стаў вучнем бацькі і ў рэжысуры, і ў жыцці.

Магчыма, яшчэ рана казаць аб творчай пераемнасці. У многім фільмы Уладзіміра Дашука недасканалыя, з незакончанай думкай, ідэяй. Але тое, што яны партрэтныя — безумоўны плюс і рэжысёру, і чалавеку — Уладзіміру Дашуку. Таму што, каб ісці на шчырую размову з чалавекам (а без такога дыялога сучасная дакументалістыка немагчыма, калі гэта сапраўдная публіцыстыка), патрэбна валодаць пэўным запасам душэўных сіл, жыццёвым вопытам, нарэшце, упэўненасцю ў тым, што герой будзе цікавым для гледача.

Марадзёр з «Граху» і народны скульптар з «Партрэта з сякерай» — індывідуальнасці. Рэжысёр у гутарцы з імі гэта ўсяляк падкрэслівае, спрабуе іх раскрыць, зразумець, дапамагчы зрабіць гэта гледачу.

Фільм «Партрэт з сякерай» (аўтары Ул. Дашук, С. Смірноў) атрымаўся, на мой погляд, крыху сумным, драматургічна рыхлым, пазбаўленым дынамікі. Цікавыя факты сцэнарыя, напоўненага людзьмі — аднавяскоўцамі мастака, ды і сам Іван Супрунчук здаваўся асобай самабытнай і моцнай. У фільме ж герой мала цікавы, схематычны, нейкі сімвал «народнай душы». Пачаўшы пабудову драматычнага канфлікту як супрацьборства духоўнага і бездухоўнага, рэжысёр — ён жа аўтар дыктарскага тэкста — зусім нечакана заяўляе ў сярэдзіне фільма, што яго больш цікавіла сям'я, чым скульптуры Івана. І гэтым разбурае стройнасць думкі, драматургічнага рашэння фільма. На мой погляд, найбольш удаліся шчырыя гутаркі з маці мастака. У іх цалкам праяўляецца талент Дашука-журналіста: уменне слухаць чалавека, накіроўваць гутарку, перадаваць гледачу сваю любоў да героя. Больш таго, мне здаецца, што калі б фільм быў пра гэту жанчыну, якая шмат пабачыла на сваім вяку,— гэта быў бы поспех.

Сцэнарый «Граху» («Марадзёры») І. Дылеўскага ўяўляў закончаны драматургічны твор, дзе прадумана ўсё — ад дакладна пастаўленай праблемы, да яе вобразнага вырашэння. Пазіцыя аўтара была зразумелай — адмоўная. Ды іншай яна і быць не магла.

Але рэжысёр паглядзеў на праблему шырэй. Толькі ў сцэнарыі засталіся тыя, хто абкрадаў пакінутыя жыхарамі дамы ў Нараўлянскім і Брагінскім раёнах, хто «чысціў» дачы ў Мінскай вобласці. Рэжысёра ж больш непакоілі прычыны, вытокі марадзёрства ў наш час. Адкуль яны ўзяліся? Што парадзіла гэтых людзей, для якіх няма нічога святога? Упершыню аб гэтай з'яве загаварыў А. Вазнясенскі ў паэме «Роў».

Адна дзеючая асоба (героям назваць ніяк не магу) тлумачыць, што яна выросла на адмоўных адносінах да рэлігіі і рабаваць цэрквы — не сорамна. Ён цудоўна памятае, як здымалі крыжы з купалаў, як «улады» зачынялі цэрквы, якія потым ператваралі ў нарыхтоўчыя пункты.

«Душа» была знішчана, як нешта нематэрыяльнае, як і паняцце «грэх», тое, што супрацьпастаўлялася ёй. Магчыма, менавіта тады былі закладзены першыя цаглінкі ў сцяну бяздушша, беспакаранасці і ўсёдазволенасці. А пазней, калі ідэалы і ісціны, здабытыя крывёю і мукамі людзей, сталі проста лозунгамі, гэта сцяна атрымала свой закончаны выгляд. А. Блок аднойчы сказаў: «Юнацтва — гэта адплата».

Хлопец, які не існаваў у сцэнарыі, у фільме — галоўная дзеючая асоба. Промысел на закінутых могілках ён апраўдвае так: у магілах ляжаць астанкі белагвардзейцаў. Гэта магілы ворагаў, таму сумленне яго чыстае.

— І ўсё ж, навошта ты гэта робіш? — пытаецца рэжысёр.

— Дзеля вышэйшай ісціны,— адказвае марадзёр (ён, дарэчы, з такім азначэннем цалкам згодны). Але што гэта за ісціна? Ды і наогул ці існуе яна для гэтага хлопца? Мы так і не даведаемся. І віна ў гэтым — рэжысёра. Тым больш, што яго ўстаноўка на героя даволі зразумелая: у чалавека ёсць свая філасофія, сваё бачанне свету, свае адносіны да яго. Ён не вузкалобы прымітыў, які хоча любымі спосабамі зарабіць.

— Гэта Мефістофель, у якога адабралі веру ў бога, а веру ў чалавека не далі,— так сказаў пра героя Уладзіміра Дашука Аляксандр Герман на заключным пасяджэнні XVI агляду-конкурсу творчай прадукцыі «Беларусьфільма» за 1987 год. І дадаў: — Рэжысёр зразумеў і палюбіў яго, таму не змог падняцца над ім. А быў жа зусім блізка ад поспеху.

Пазіцыя Уладзіміра Дашука ў адносінах да свайго героя так і застанецца незразумелай. Апошняе інтэрв'ю пасля воінскай прысягі пачынаецца з пытання: «Артур, гледачам так і не будзе зразумела, які ты: добры ці дрэнны? А што ты думаеш пра сябе?»

А ён нічога не думае — няхай глядач усё вырашае сам. Гэта адказ і Дашука таксама. Аўтар не перашкаджае гледачу, нічога не навязвае, пакідае права выбару за ім. Асабліва маладому гледачу, якога любое навязванне думкі прымусіла б зрабіць адваротны крок і цалкам прыняць Артура «за свайго», таму што ён часта гаворыць пра праблемы, якія зразумелыя многім людзям.

Развенчвання няма ў гэтай стужцы, але ж і п'едэстал нікому не будуецца. Рэжысёр аддае перавагу ў публіцыстыцы прынцыпам дакладнасці і праўдзівасці, а не тэндэнцыйнасці. У гэтым бачыцца яго павага да гледача, жаданне размаўляць з ім на роўных. Не даруючы, не апраўдваючы, рэжысёр усё ж спрабуе зразумець. На мой погляд, гэта прынцып будучага — будучай размовы гледача і мастака, розных пакаленняў, проста зносін людзей.

Этапнай у творчасці Уладзіміра Дашука з'яўляецца стужка «Пейзаж пасля бітвы», тэму якой можна вызначыць словамі: Чарнобыль, зона, людзі. Але аб гэтым у час наступнай размовы.

Ж. МІХАЙЛАВА.

БАЛЕТ, БАЛЕТ, БАЛЕТ...

У віхуры танца — жыцця сэнс

И звуки музыки слились
с порывом, трепетом движенья,
и понеслось по залу ввысь
дыханье танца вдохновеньем.

«З усіх мастацтваў балет здаецца мне самым радасным і святочным»,— пісала вядомая савецкая балерына Таццяна Вячаслававa. Здаецца? Не толькі. Гэта сапраўды так. Проста ў любога свята, і балет не выключэнне, ёсць будні, шэрыя і сырыя, сумныя і цяжкія, але менавіта гэты рабочы цяжар нараджае лёгкасць і свабоду выканаўцаў для гледача, для нас.

Гучаць акорды, падымаецца заслона і... — падумаць толькі, без усялякай машыны часу — мы пераносімся ў пазамінулае стагоддзе, калі на сцэне «Спячая прыгажуня» або «Лебядзінае возера», або яшчэ далей: да вытокаў жыцця чалавечага — «Стварэнне свету». І ўсё выглядае складана і проста, зразумела і загадкава. Танец, рух, мастацкі свет — абыходзяцца без перакладчыка. Іх мова гучыць без слоў, ды слова і не ў стане іх раскрыць — гэта іншае вымярэнне, іншая сфера, што кліча і прыцягвае, захапляе, але не патрабуе таталітарнасці разумення, асэнсавання адзінага. Кожны разам з кампазітарам, балетмайстрам, мастаком, рыжысёрам стварае свой твор для сябе сам. Як адчувае, думае, разумее. Колькі гледачоў — столькі аўтараў, і таму кожны балетны спектакль — гэта радасць адкрыцця творчай работы.

Паверце, застацца абыякавым вельмі цяжка: надта моцны і цудоўны букет мастацтваў, сабраных разам і паднесеных — Вам.

Спачатку было слова, але яшчэ раней — рух, які нарадзіў яго. Дзіця яшчэ не можа гаварыць, але так забаўна і люба варушыць ручкамі і ножкамі! Так і чалавецтва ў сваім маленстве пачынала жыццё і зносіны з руху і танца, у гэтым першынстве сакрэт яго ўсеразумеласці і ўсеагульнасці.

Беларускі балет нарадзіўся пазней маскоўскага, і трупа, безумоўна, не такая вядомая і славутая, як Вялікага ці Кіраўскага тэатраў. Але галоўны балетмайстар В. Елізар'еў упаўне мае права кінуць пад ногі Ю. Грыгаровічу белую пальчатку, якая кліча да спаборніцтва ў паядынку.

Хто хоча перакананца ў гэтым сам, калі ласка, шчыра запрашаем у Вялікі тэатр БССР, што на плошчы Парыжскай камуны (былой Траецкай гары). Аднак пра білеты просьба паклапаціцца загадзя — пасля з'яўлення ў горадзе афіш у тэатральных касах білеты хутка таюць.

Толькі за апошнія гады горад, ды і рэспубліка (на ўсю Беларусь трупа Елізар'ева адзіная) былі парадаваны парадам прэм'ерных спектакляў. І якіх! «Карміна-Бурана», «Вясна свяшчэнная», «Рамэо і Джульета», «Спячая прыгажуня». Прычым, пастаноўка «Вясны» на музыку І. Стравінскага прызнана лепшай у СССР.

Але, як вядома, лепшым доказам бясспрэчнай і сапраўднай значнасці ў НАС служыць прызнанне ў IX. Заходнія прадзюсары бесперапынна праяўляюць непадробную цікавасць, што выліваецца ў канкрэтныя запрашэнні, да беларускага балета. Ніводзін з апошніх сезонаў тэатра не быў абдзелены гастролямі за мяжой. Вось і зараз аматары і прыхільнікі мастацтва танца ведаюць: пасля 14 лютага з тэатральных афіш і са сцэны зніклі балетныя пастаноўкі — тэатр зноў у ад'ездзе, на гэты раз у Індыі. Як ён будзе прыняты ў краіне, што славіцца сваімі спевамі і танцамі?

Вернецца тэатр, вернецца і прэм'ера «Спячай прыгажуні», якая што кольвечы пачалася і партыю ў якой не паспела выканаць заслужаная артыстка БССР Т. Яршова (канфліктная сітуацыя з Елізар'евым з-за паклону закончылася для яе адхіленнем ад першай прэм'еры і строгай вымовай), вернецца на сцэну з заганнага круга траўм любіміца публікі заслужаная артыстка БССР І. Душкевіч і зноў для артыстаў пачнуцца будні рэпетыцый і ўрока харэаграфіі, а для нас, гледачоў, узновяцца радасныя спатканні з цудоўным, прыняць удзел у якіх ніколі не позна.

Далучэнне да «самага радаснага і святочнага з усіх мастацтваў» абварожыць, абагаціць, узвысіць, і тады стане немагчымым і сумным жыццё без балета, без віхур, хваляў і пульса танца...

В. КІСЯЛЁВА.

НА ЗДЫМКУ: сцэна з балета «Вясна свяшчэнная».



ДОШКА АБ'ЯЎ

«ХРОНІКА ЖЫЦЦЯ

Ісуса Хрыста» па Евангеллю ад Лукі — каляровая мастацкая стужка, якая будзе дэманстравацца 2-га сакавіка ў 14.30 у актавай зале галоўнага корпуса. Кошт білета 1 руб. Набыць яго можна ў студэнцкім клубе (п. 401 галоўнага корпуса).

ЗА КУЛІСАМІ

Касцюкоўскі і кампанія

Паэт і кінадраматург Якаў Касцюкоўскі вядзе запісы цікавых размоў са сваімі сябрамі: артыстамі, рэжысёрамі, драматургамі...

Б. АНДРЭЕЎ.
— Вы былі ў Кіеве, Барыс Фёдаравіч?
— Так. Дарэчы, бачыў там Вашу карціну.
— Ну, і як Вам?
— А што Вам сябры кажуць?
— Пакуль нічога.
— Як нічога? Няўжо Тарапунька не сказаў, што Вы напісалі геніяльны сцэнарый?
— Не.
— А Штэпсель не павіншаваў з вялікім поспехам?
— Не.
— І Бернэс не хваліў?
— Не, не хваліў.
— Тады ў Вас сумленныя сябры.

М. БЕРНЭС.
— Ты ўжо мемуары пішаш?
— Не. Так, тое-сёе запісваю... Пра цікавых людзей.
— І пра мяне ёсць?
— Вядома, запісваю ўсё, пачынаючы з нашага знаёмства...
— І шмат ужо запісаў?
— Дастаткова...
— А ты ўжо дайшоў да таго дня, калі ўзяў у мяне пласцінку Азнавура, якую і сёння не вярнуў?

Я. СМЕЛЯКОЎ.
— Між іншым, з цябе належыць. У тваёй «Аперацыі «Ы» чытаюць мае вершы.
— Добра.
— Тады палову ганарару.
— Палову?
— Добра, добра, супакойся... Я пажартаваў. Не трэба мне нічога. У мяне самога грошай куры не клююць... Таму што няма ні кур, ні грошай.

М. ЯНШЫН.
— Чаму Вы не здзіўляецеся з таго, як я пахудзеў?
— Так, я заўважыў. Адкрыйце сакрэт.
— А Вам навошта?
— Для адной актрысы. Адны ёй прапануюць бегаць, другія — Кіславодск.
Хай робіць і адно, і другое.
— Не зразумеў...
— Няхай бяжыць у Кіславодск.

І. ПЫРЄЎ: Што з Вамі, Іван Аляксандравіч?
— Жудасны спектакль. Я болей не магу. Пойдзем.
— Няёмка.
— Іншыя ж, глядзі, выходзяць.
— У іх ёсць білеты.
— Туды і назад?
— Ва ўсялякім выпадку, яны іх куплялі, а нас запрасіў аўтар п'есы.
— Ну, добра. Дачакаемся антракту, куплю білеты і пайду на законнай аснове.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка

1 САКАВІКА
Зак. 2005

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 2, ПАВЕРХ 4

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.